ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Магілёўскага аблвыканкама
_____________ І.Г.Лашкевіч
«20» сакавіка 2023 г.

# ЗАДАННІ
## для правядзення гарадскіх, раённых алімпіяд па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”

Дата правядзення: 29 сакавіка 2023 г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 12.00.

## V клас

**Заданне 1. Адкажыце на пытанні.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

1. Кожнаму каляндарнаму месяцу прысвячаўся шэраг прыказак і прымавак, якія раскрывалі яго сутнасць у народным уяўленні, распавядалі пра надвор’е ў гэтым месяцы, прыкметы, звязаныя з ім, і сялянскія клопаты і турботы. Дапішыце прыказку (заключнае слова павінна рыфмавацца з адным са слоў у першай частцы прыказкі)?
   *Сакавік часамі снегам сее, а часамі сонцам _________.*
2. ________________ – *гэта фантастычнае апавяданне, заснаванае на паэтызацыі гістарычных падзей і ўслаўленні народных герояў.* Запішыце тэрмін, сэнс якога раскрываецца ў азначэнні.
3. Запішыце назву аднаго з беларускіх народных танцаў: _______________.
4. Узгадайце казку Я. Коласа, да якой падыходзяць словы Я.Купалы *“Не шукай ты шчасця, долі. На чужым, далёкім полі”* ў якасці парады галоўнай гераіні.__________________
5. Колькі літар у беларускім алфавіце? _____. Запішыце літару беларускага алфавіта, якая ёсць толькі ў беларускай мове ____.

**Заданне 2. Настаўнік беларускай мовы і літаратуры перад урокам сказаў вучням:** *“Дзеці, зарубіце сабе на носе: сёння вам прыйдзецца працаваць да сёмага поту. Калі не ўсё будзе атрымлівацца – не падайце духам, а вазьміце сябе ў рукі і зноў прымайцеся за справу. Тады напрыканцы занятку вы будзеце на вышыні”.*

**Зварот да вучняў насычаны фразеалагізмамі. Знайдзіце іх у тэксце і кожны з іх замяніце адным словам.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільна знойдзены фразеалагізм; 0,5 бала – за правільную замену).*

______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________

**Заданне 3. Адзначце азначэнні знакам “+”, у якіх правільна ўказана лексічнае значэнне слова, “-”, у якіх няправільна.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| | |
|---|---|
| “нядзеля – адрэзак часу ў сем дзён” | |
| “бяспека – становішча, пры якім ніхто і нішто не пагражае каму- або чаму-небудзь” | |
| “вернісаж – спектакль у гонар або на карысць аднаго з яго ўдзельнікаў” | |
| “геральдыка – эмблема дзяржавы, горада, якая змяшчаецца на сцягах, дзяржаўных дакументах і інш.” | |
| “млынар – уладальнік млына ” | |

**Заданне 4. Вызначце, якія гукі абазначаны падкрэсленымі ў словах літарамі, і ўстанавіце адпаведнасць паміж першым і другім слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў. Памятайце, што некаторыя даныя другога слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.**

**Прывядзіце ўласныя прыклады, у якіх бы адна з літар абазначала адпаведны гук. Запішыце па адным слове ў трэці слупок.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за правільнае размеркаванне кожнай лічбы і 0,5 бала – за правільна прыведзены прыклад).*

| Прапанаванае слова | Гук | Уласны прыклад |
|---|---|---|
| **А.** Касьба | **1.** [з’] | |
| **Б.** Расчуліць | **2.** [с’] | |
| **В.** Князь | **3.** [ш] | |
| **Г.** Развязка | **4.** [с] | |
| | **5.** [з] | |

**Адказ: А_ ; Б__; В __; Г __.**

**Заданне 5. Запішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары ў словах, у такой паслядоўнасці, каб атрымаўся тэкст.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (3 балы – за правільна пабудаваны тэкст; 0,2 бала – за кожную правільна ўстаўленую літару).*

1. Яшчэ ў жні..ні яны абч..пліваюць правады, дружна ч..рыкаюць, склікаюць с..броў. 2. Хто з крылатых с..броў адл..тае ў вырай раней? 3. Праз тыдзень пасля ластавак адл..таюць жаваранкі. 4. А ўслед за жаваранкамі ля..яць шпакі, буслы і іншыя птушкі. 5. Перш..мі ў адлёт збіраюцца ласта..кі.

**Заданне 6. Вызначце, якім членам сказа з'яўляецца выдзеленае слова (графічна падкрэсліце).**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

1. **Дзяжурны** добра выконваў свае абавязкі. 2. Калісьці млын быў у **кожнай** вёсцы. 3. Людзі ў нас **працавітыя**. 4. Лес – жывая **вопратка** зямлі. 5. **Дзяўчаты**, на жарты не крыўдуйце.

**Заданне 7. Разгледзьце ўважліва малюнак. Якой беларускай прыказцы ён адпавядае? Складзіце невялікі тэкст, у якасці назвы запішыце ўзгаданую прыказку.**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*



**Заданне 8. Суаднясіце малюнкі і тэксты. Суаднясіце лічбу і літару (напрыклад, А1, Б2, В3, Г4, Д5). З якіх твораў прыведзеныя ўрыўкі? Пазначце імёны аўтараў і назвы твораў.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,25 бала – за кожны правільны адказ, 0,5 бала – за кожную правільна вызначаную назву твора, 0,5 бала – за кожнага правільна названага аўтара твора).*

| | |
|---|---|
| **А.** Пайшоў ён, прымасціўся на драбінах ды выцінае сабе на дудцы розныя полечкі. Усю ноч іграў, а пад дзень дужа спаць захацелася,— ён і задрамаў. Раптам праз сон чуе: нешта над галавою моцна зашумела, залопала. Пакуль прачнуўся — зноў аднаго яблыка няма! Брыдка яму ў хату ісці, ды што зробіш: не дапільнаваў злодзея.<br><br>Назва твора ____________________________<br>Аўтар__________________________________ | **1.**<br> |
| **Б.**<br>Я вольнаю птушкаю вырасла тут.<br>Жыве тут мой суджаны-мілы.<br>І нас не разлучаць ні годы пакут,<br>Ні гнеў твой, ні грозная сіла.<br>– Яшчэ мы пабачым! – Барына ўскіпеў<br>І, злосны, каня ён прышпорыў,<br>Панёсся, як прывід, і знік сярод дрэў<br>Старога спрадвечнага бору.<br><br>Назва твора ____________________________<br>Аўтар__________________________________ | **2.**<br><br> |
| **В.**<br>Прыняў іх разам з калёсамі мокры і чорны лістападаўскі лес. Часцей і часцей пачалі трапляцца між дрэў аленевыя, а можа і чалавечыя косці. Прыехалі. Зрабіў Пятро з яловага лапніку будан, паклаў у салому торбу. Нацягаў сушняку, насек яго дробна. Развёў цяпельца. Дастаў з торбы хлеб, сала, біклажку з віном.<br>— Гэта нашто? — спытаў бацька. — Бяры ўсё. І салому бяры.<br><br>Назва твора ____________________________<br>Аўтар__________________________________ | **3.**<br> |

| Г.<br>Трапіць госць у будзень, а ці ў свята:<br>– Калі ласка, калі ласка, ў хату!<br>Не паспелі сесці пры сустрэчы,<br>Як патэльня засквірчэла ў печы,<br>Ды і чарка бліснула дарэчы.<br>Бульба, смажаніна і каўбаска,<br>Пакаштуйце, людцы, калі ласка!<br><br>Назва твора ____________________________<br>Аўтар__________________________________ | 4.<br> |
| --- | --- |

Адказ: А __, Б__, В__, Г__, Д__.

**Заданне 9. Узнавіце радкі верша, якія прапушчаны. Хто з'яўляецца аўтарам гэтых радкоў?**
*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожнае правільна ўзноўленае слова, 1 бал – за правільна вызначанага аўтара).*

Здароў, марозны, звонкі вечар!
Здароў, _____________, мяккі снег!
Мяцель не вее, сціхнуў вецер,
І волен лёгкіх ____________ бег.

Як мары, белыя ______________
Пад сінявой начной стаяць,
У небе зоркі ад марозу
__________________ дрыжаць.

Вільготны месяц _________ на поле
Празрысты, светлы стоўп ____________
І рызай срэбнаю раздолле
Снягоў сінеючых пакрыў.

Ўзрывайце ж іх санямі, ____________!
Звіні, вясёлых бомаў ___________!
Вакол лятуць бары і гоні,
Ў грудзях пачала кроў кіпець.

Аўтар ___________________________

**Заданне 10. Дапішыце герояў, каб атрымалася пара супрацьлеглых герояў з аднаго твора.**
*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожную пару).*

Разумная дачка – _________________, Найрыта –________________, магнат ненавісны Барына – _______________, сусед Гнат – _____________, меншы сын Іван – ____________________.